пачуцця патрыятызму, гонару за свой рэгіён, а з іншага з'яўляецца эфектыўным сродкам папулярызацыі «малой радзімы».


*1.* Брендинг территорий как путь к спасению депрессивных регионов // Капитал страны [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.kapital-rus.ru/articles/article/143220. – Дата доступа: 04.08.2018

2. *Гончарова, С. А.* Бренд региона как фактор сохранения самобытности в условиях глобализации / С. А. Гончарова, М. В. Ганькина // Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва : матэрыялы навуковай канферэнцыі (Мінск, 28 лістап. 2014 г.) / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. – Мінск, 2016. – С. 77–80.

3. *Журавский, А.* Брендинг регионов: капитализация этнокультурного потенциала и культурная индустрия / RATAnews [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.ratanews.ru/news/news30092011_3.stm – Дата доступа: 27.06.2018/.

*4.* Рэспубліканская праграма мерапрыемстваў па правядзенні ў Рэспубліцы Беларусь 2018–2020 гадоў пад знакам Года малой радзімы [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C21800547&p1=1&p5=0. – Дата доступу: 27.07.2018.

5. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 247 «Аб правядзенні Года малой радзімы» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://president.gov.by/uploads/documents/2018/247uk.pdf – Дата доступу: 27.07.2018.


## ДА ПЫТАННЯ АБ ПАДЫХОДАХ У РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ СУЧАСНАСЦІ КРАЯЗНАЎЧЫМІ МУЗЕЯМІ БЕЛАРУСІ


***С. В. Гаўрылава,***

*загадчык філіяла Нацыянальнага*

*Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка*


Адной з галоўных задач краязнаўчага музея з часоў яго фарміравання ў традыцыйным для нас разуменні было адлюстраванне сучасных яму працэсаў, якія адбываліся ў сацыякультурным жыцці вызначанага рэгіёна. Сёння гэта задача набыла асаблівую актуальнасць у сувязі са зменай у канцы XX – пачатку XXI ст. метадалагічных падыходаў да рэпрэзентацыі гісторыі ў музеях гістарычнага профілю. Для выпрацоўкі актуальнага канцэптуальнага рашэння раздзела сучаснай гісторыі ў экспазіцыі краязнаўчага музея бачыцца неабходным разгледзець асноўныя падыходы да азначанага пытання ў XX ст.

У пачатку XX ст. ішла выпрацоўка асноўных прынцыпаў пабудовы экспазіцыі краязнаўчага музея, а яго звычайна вы-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значалі як «мясцовы» музей ці «музей мясцовага краю». Тагачасныя музеі на месцах разглядаліся ў якасці асяродкаў па захаванні і прэзентацыі сведчанняў мясцовай духоўнай творчасці. «Так как полнота этой картины может быть достигнута только в том случае, если в ней будет выражена тесная связь местного духовного творчества с людьми, бытом и природой, среди которых развивалось это творчество, то ясно, что главная часть местного музея должна объединить в себе все наиболее характерное для природы, быта, населения и творчества данной местности или края» [3, с. 12]. У першыя паслярэвалюцыйныя гады такі падыход захаваўся. «Музеи были поставлены на службу трудящимся с первых же дней установления Советской власти, призывающей бдительно беречь культурное достояние народа. "Это наследство, – говорилось в одном из ноябрьских воззваний Исполнительного комитета рабочих и солдатских депутатов в Петрограде, – воплощение духовной силы вашей и предков ваших… все это ваша история, ваша гордость"» [2, с. 6]. Аўтар нарыса «Местные музеи и как их устраивать» М. І. Раманаў пісаў, што «мысль, лежащая в основе местного музея, всегда одна и та же – дать наглядную и всестороннюю картину данной местности» [3, с. 12]. У сувязі з гэтым ён адзначаў: «Понятие о современном культурном состоянии края могут дать материалы, относящиеся к работе земств, общественных организаций, кооперации, как например, планы и модели общественных сооружений, дорог, школ, больниц, народных домов, таблицы и кривые с различными данными статистики» [3, с. 13].

У снежні 1930 г. адбыўся I Усерасійскі музейны з'езд, на якім былі сфармуляваны асноўныя ідэалагічныя задачы тагачасных музеяў. У адным з агучаных на з'ездзе дакладаў (у прыватнасці, у дакладзе прафесара філасофіі І. К. Лупалы «Диалектический материализм и музейное строительство») дыялектычны матэрыялізм быў абвешчаны як адзіны навуковы метад. Рэзалюцыя з'езда замацавала задачу «не только отражения настоящего и прошлого, но и строительство будущего на основе линии коммунистической партии», «активизировать посетителя, поставить его перед основными задачами современности и четко указать ему общий лозунг» [1, с. 665] (пры гэтым сучаснасць пастаўлена на першае месца).

Судакладчыкам І. К. Лупалы выступіў музеязнавец Н. А. Шнеерсон, з лёгкай рукі якога аддзел сацыялістычнага будаўніцтва стаў абавязковым завяршальным аддзелам экспазі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыі краязнаўчага музея, а яго задачай – «грандиозность происходящего переустройства народного хозяйства» [1, с. 701]. Пазней, у 1936 г., ён пісаў: «В истории нашего музейно-краеведческого строительства одно время (1930–1933) был весьма популярен лозунг: «С историей мы истории не сделаем», когда от краеведческого музея требовали только показа советского строительства. В результате – богатейшие исторические коллекции выкидывались...» [1, с. 702].

У хуткім часе па заканчэнні Вялікай Айчыннай вайны вышэйшая выканаўчая ўлада БССР звярнула ўвагу толькі на неабходнасць паляпшэння экспазіцыйнай інтэрпрэтацыі падзей савецкай гісторыі. У 1947 г. Савет Міністраў БССР прыняў пастанову «Аб мерапрыемствах па паляпшэнні паказу сацыялістычнага будаўніцтва ў музеях БССР», якая перад краязнаўчымі музеямі ставіла задачу арганізаваць мэтанакіраванае, комплекснае камплектаванне фондаў матэрыяламі па сацыялістычным будаўніцтве, пераважна рэчавага характару.

У 1948 г. адбылася пашыраная сесія вучонага савета Навукова-даследчага інстытута краязнаўчай і музейнай работы, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі БССР. На сесіі было прынята «Палажэнне аб абласным, краёвым, рэспубліканскім (АССР) краязнаўчым музеі», у якім была замацавана аднолькавая для ўсіх музеяў структура. Асноўнымі былі аб’яўлены тры аддзелы – прыроды, дарэвалюцыйнага мінулага і савецкага перыяду. У апошнім выдзяляліся раздзелы гісторыі і сацыялістычнай гаспадаркі і культуры. Як бачна, адбылася канчатковая ўніфікацыя экспазіцыйнай структуры краязнаўчых музеяў. Экспазіцыйны час у адносінах да дагістарычнага, старажытнага і дасавецкага перыядаў быў моцна сціснуты, а ў адлюстраванні савецкай рэчаіснасці, наадварот, расцягнуты.

Уніфікацыя экспазіцый прывяла да «сцірання» рэгіянальных рыс і асаблівасцей, не дзіўна, што самым нецікавым аддзелам у праведзеным супрацоўнікамі Навукова-даследчага інстытута краязнаўчай і музейнай работы ў 1970-я гг. даследаванні наведвальнікі назвалі апошні – савецкага перыяду – сучаснай ім рэчаіснасці. Адзін з аўтараў даследавання Д. А. Равіковіч у артыкуле «Фактары развіцця краязнаўчага музея» адзначала: «В самом обобщенном виде проблемы экспозиций периода развитого социализма сводятся... к следующим основным положениям: ...вызывают необходимость... связи с ведущими, перспективными и специфическими для края направлениями развития экономики. Внимание посетителей должно быть привлечено

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

к роли людей в производственных процессах, к новым явлениям в науке, культуре, народном образовании, в быту; масштаб и бурные темпы социально-экономического развития края не всегда своевременно отражаются в музейных экспозициях» [1, с. 826].

У 1980-х гг. крытыка краязнаўчых музеяў узмацнілася. Да прыкладу, у 1987 г. выйшаў зборнік навуковых прац «Пытанні навуковага зместу экспазіцый краязнаўчых музеяў», які ўтрымліваў артыкулы, прысвечаныя крытыцы ўсіх аддзелаў экспазіцый краязнаўчых музеяў і вызначэнню шляхоў пераадолення «негативных тенденций на основе достижений современной науки». Аўтары аднаго з артыкулаў – В. Златавустава і Г. Кузіна – прааналізавалі сучасны ім стан навуковага зместу экспазіцый аддзелаў гісторыі савецкага грамадства і выявілі прычыны недастаткова глыбокага раскрыцця шэрагу экспазіцыйных тэм, унеслі прапановы па вырашэнні гэтай праблемы. Даследчыкі адзначылі дастатковую ўвагу краязнаўчых музеяў да адлюстравання кіруючай ролі КПСС у развіцці савецкага грамадства праз матэрыялы з'ездаў, пленумаў, дакументы дэлегатаў і ўдзельнікаў, а таксама да прадстаўлення асабістых звестак аб камуністах, якія працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі. Недахоп у гэтым – малая ўвага да матэрыялаў аб дзейнасці мясцовых партыйных арганізацый і інфармацыі аб камуністах ніжэйшага звяна. Такія тэмы, як «Развіццё савецкай дэмакратыі» і «Сацыяльная накіраванасць развіцця сацыялістычнай эканомікі на няўхільнае павышэнне дабрабыту народа» найбольш поўна былі прадстаўлены ў аддзеле па сучаснасці, а ў папярэдніх – прадстаўлены значна слабей ці ўвогуле не раскрыты. Асаблівую ўвагу музейным супрацоўнікам раілася звярнуць на тэму «Сацыялістычны лад жыцця», які меў прынцыповае значэнне для характарыстыкі савецкага грамадства. Шырока выкарыстоўвалася ў экспазіцыях рэпрэзентацыя такіх элементаў «савецкага ладу жыцця», як юбілеі, працоўныя традыцыі, аднак было мала сведчанняў сучасных формаў удзелу моладзі ў грамадскім жыцці. У артыкуле было асабліва адзначана, што паказ негатыўных з'яў жыцця не ўваходзіць у задачы музеяў.

У 1990-я гг., калі адбыліся змены ў метадалогіі гісторыі, калі музеі сталі дэманціраваць ці ўносіць змены ў існуючыя экспазіцыі пасляваеннага аднаўлення і сацыялістычнага будаўніцтва, актывізавалася музеелагічная думка, развіццё якой пайшло ў двух кірунках. Першы – гэта распрацоўка тэарэтычных пы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

танняў музейнай канцэпцыі гісторыі, інтэрпрэтацыі і рэпрэзентацыі гісторыі ў адпаведных экспазіцыях. Другі звязаны з аналізам набыткаў практык на ніве распрацоўкі навуковых канцэпцый і стварэння новых экспазіцый, у тым ліку і па найноўшай гісторыі. Сучасныя набыткі беларускага музеязнаўства ў справе рэпрэзентацыі сучаснасці ў краязнаўчых музеях рэспублікі вартыя асобнага артыкула.

*1.* Музееведческая мысль в России XVIII–XX веков : сб. док. и матер. / колл. авт. // отв. ред. Э. А. Шулепова. – М. : Этерна, 2010. – 960 с. : ил.

*2. Ревякин, В. И.* Историко-краеведческие музеи / В. И. Ревякин, А. Я. Розен. – М. : Стройиздат, 1983. – 136 с. : ил.

*3. Романов, Н. И.* Местные музеи и как их устраивать / Н. И. Романов. – М. : Изд. Комитета по охране худож. сокровищ при совете Всерос. коопер. съездов, 1919. – 112 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ИНТЕРАКТИВНАЯ ИНФОГРАФИКА КУЛЬТУРНЫХ ДОСТОПРИМЕЧАТЕЛЬНОСТЕЙ БЕЛАРУСИ

***П. В. Гляков,***
*кандидат физико-математических наук, доцент, заведующий кафедрой информационных технологий в культуре Белорусского государственного университета культуры и искусств;*
***В. И. Воробьева,***
*администратор центра визуальных и исполнительских искусств «АРТ Корпорейшн»*

Под инфографикой понимают графический способ передачи информации, данных и знаний. Простейшая инфографика – это графики, круговые диаграммы, карты, таблицы, схемы. Более сложная инфографика является комбинацией текстовых блоков, фотографий, карт, таблиц, диаграмм и даже комиксов. В инфографике можно выделить три вида: статический, динамический и интерактивный.

Понятие «инфографика» является близким к понятию «иллюстрация», но не синонимом. Иллюстрация – это часть визуального оформления, то есть одна из составляющих дизайна. Но задача дизайна – тираж большого количества изображений с заданными правилами стилистики, а задача инфографики – передача знаний, т. е. представление истории так, чтобы ее смог «прочитать» человек, который вовсе не умеет читать.